Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

№ 8 (28624)

12 СТУДЗЕНЯ 2018 г.

ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

+TV ПРАГРАМА

Шляхі беларускай «экаежы»

Рыхтаваць дровы загадзя

Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Вячаслаў ШЫЛА, намеснік міністра аховы здароўя:

«На гэтым этапе ставіцца глабальная задача — інфарматызацыя галіны, накіраваная на аб'яднанне ўсіх устаноў аховы здароўя. Плануецца стварэнне адзінага інфармацыйнага асяроддзя, складовай часткай якога стане інтэграваная электронная карта пацыента, аўтаматызаванае працоўнае месца ўрача, асабісты інтэрнэт-кабінет пацыента. Ставіцца задача выйсці на ўзаемадзеянне з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, іншымі дзяржорганамі. Адзінае інфармацыйнае асяроддзе аб'яднае ўсе медыцынскія цэнтры і фармацэўтычныя сеткі, у тым ліку недзяржаўнай формы ўласнасці. Усё гэта будзе выгадна найперш самому пацыенту».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2018 г.

Долар ЗША	2,0188	▲
Еўра	2,4093	▲
Рас. руб.	0,0354	■
Укр. грыўня	0,0709	▼

ISSN 1990 - 763X

МАМЫ РОЗНЫЯ ПАТРЭБНЫ

Галоўная славутасць Вілейкі — скульптурная кампазіцыя «Маці з дзецьмі», якая знаходзіцца ў цэнтральным парку горада. Тут вельмі любяць праводзіць час маладыя сем'і з дзецьмі. На фота Святлана ГАЛУБЕНКА з маленькай дачкой Кацярынай.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

■ Гарадское жыццё

Калі ў парыльні — суседзі па раёне

Ці папулярныя сёння грамадскія лазні і колькі гэта каштуе?

У сталіцы працуе восем грамадскіх лазняў. За мінулы месяц іх наведала 35 тысяч гараджан. «Звязда» даведалася, хто ходзіць у грамадскія парыльні, колькі каштуюць гэтыя паслугі і якой будзе пасля рэканструкцыі лазня № 1.

НІЯКІХ СЛОІКАЎ З ГРЫБАМІ І СЕЛЯДЦА!

У будны дзень у лазню № 7 прыходзіць 250—300 гараджан. У суботу і нядзелю наведвальнікаў амаль удвая больш — па 500 чалавек.

— У нас рускія парыльні. Тэмпература ў іх 60—70 градусаў, вільготнасць паветра — 80 працэнтаў, — расказвае **загадчык лазні Вячаслаў КІРГІЗ.** — Парыльні праграюцца за шэсць—восем гадзін да пачатку сеансаў, а потым яшчэ прапальваюцца гадзіну пасля абеду.

На ўваходзе прадаюцца венікі — бярозавыя па 3,75 рубля і дубовыя па 3,80. Кажуць, наведвальнікі часта іх купляюць.

СТАР. 7

■ Майстар-клас

НАСТАЎНІКІ СЕЛІ ЗА ПАРТЫ

Як педагагічныя «зоркі» дзяліліся сваім досведам з калегамі

«Цудоўная атмасфера адзінства, мора крэатыву і пазітыву», «Натхняльна, пазітыўна, радасна», «Здзіўлена і зачаравана энтузіязмам, працалюбствам і прафесіяналізмам усіх выступоўцаў», «Радасць і гонар за калег!», «Усё было супер!», «Цікава! Карысна! Актуальна! Хачу яшчэ!» — такія ўражанні пакідалі ў вагонах імправізаванага навагодняга экспрэса ўдзельнікі Рэспубліканскага каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, які прайшоў у сценах Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўжо сёмы раз.

Сумна тут не бывае

Да слова, сёння ніхто не можа прыгадаць, як у фестывалю з'явілася прыстаўка «калядны», хоць ён заўсёды праводзіцца падчас зімовых школьных канікул. Проста хтосьці з педагогаў напісаў аднойчы на імправізаванай агароджы: «Дзякуй за выдатны калядны фестываль!» Гэта адна са шматгадовых традыцый — напрыканцы кожнага мерапрыемства яго ўдзельнікі дзеляцца сваімі ўражаннямі і пажаданнямі на падрыхтаванай пляцоўцы, ролю якой выконвае або адмыслова аформленая агароджа, або ялінка, або навагодні экспрэс, як сёлета. Але ўскочыць у «цягнік» змаглі далёка не ўсе. Колькасць ахвотных значна перавышала фізічныя магчымасці аўдыторыі у акадэміі — пашчасціла толькі 500-м педагогам. І гэта новы фестывальны рэкорд! Рэгістрацыя на некаторыя секцыі спынілася ўжо праз паўгадзіны з моманту яе адкрыцця. Пры гэтым удзел у калядным фестывалі — абсалютна добраахвотны і ніякіх бонусаў настаўнікам быццам бы не дае. Хоць гэта, канешне, няпраўда: трапіць у асяродак аднадумцаў і неабыякавых людзей дарагога каштуе.

СТАР. 4